




Галіна ГРЫЖМАЛОВІЧ

# *Урок выніковага абагульнення па курсу*
# "Гісторыя Беларусі: другая палова XIII — першая палова XVI ст."

*VII клас*

*На ўроку выніковага абагульнення праводзіцца праверка ведаў вучняў па вучэбнаму курсу. Вучні адказваюць на пытанні вусна і пісьмова. Іх веды ацэньвае настаўнік і вучні-кансультанты.*

**Мэта ўрока:** замацаваць, абагульніць і пашырыць веды вучняў; развіваць мову вучняў, ствараць умовы для выказвання сваіх думак; выхоўваць калектывізм пры групавой рабоце і цікавасць да гісторыі сваёй Бацькаўшчыны.

**Забеспячэнне ўрока:** карткі з заданнямі, карткі для індывідуальнага апытання, памяткі для кансультантаў, насценныя карты "Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага (1220—канец XIII ст.)", "Вялікае Княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае ў XIV—XV стст.".

## План урока

**1.** Франтальнае апытанне.

**I.** Утварэнне ВКЛ.

**II.** Умацаванне велікакняжацкай улады і пашырэнне тэрыторыі ВКЛ.

**III.** Органы ўлады Вялікага Княства Літоўскага.

**2.** Самастойная работа ў групах.

**3.** Бліц-апытанне.

**4.** Падвядзенне вынікаў урока. Самаацэнка.

## Ход урока

*Уступнае слова настаўніка.* Гісторыю называюць настаўніцай жыцця. І гэта сапраўды так. Вывучаючы мінулае, мы лепш разумеем сучаснасць, у нас з'яўляецца магчымасць прадбачыць будучыню. Чалавек, які добра ведае шляхі развіцця сваёй Радзімы, становіцца патрыётам.

Вернемся ў XIII—XVI стст., успомнім пра шматэтнічную дзяржаву, у якую ўваходзілі ў той час беларускія землі — Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае. На ўроку вы будзеце працаваць у 5 групах. Дапамагаць вам будуць кансультанты, якім прапануецца памятка для групавой работы і картка індывідуальнага апытання.



***ГРЫЖМАЛОВІЧ Галіна Паўлаўна.***
*Настаўніца СШ № 173 Мінска. Нарадзілася ў в. Чапялі Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1975 г. закончыла гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Працавала старшай піянерважатай, арганізатарам выхаваўчай работы СШ № 36 Мінска, потым настаўніцай у СШ № 5, метадыстам метадычнага кабінета Заводскага раёна Мінска. Мае вышэйшую кваліфікацыйную катэгорыю.*



gisdapamoga.bspu.by

**1. Франтальнае апытанне.**

**I. Утварэнне ВКЛ.**

*Пытанні і заданні:*

1. У якім стагоддзі было створана Вялікае Княства Літоўскае? *(У XIII ст.)*

2. На якой тэрыторыі ўзнікла ВКЛ? Назавіце першую сталіцу Княства. *(На тэрыторыі Верхняга Панямоння, Навагрудак.)*

3. Пакажыце на карце першую сталіцу ВКЛ.

4. Якімі былі эканамічныя і знешнепалітычныя прычыны ўтварэння ВКЛ? *(Развіццё гаспадаркі і гарадоў, неабходнасць сумеснай абароны балтаў і славян ад набегаў крыжакоў і татара-манголаў.)*

5. Якімі шляхамі ішло аб'яднанне беларускіх і літоўскіх зямель? *(Ваеннай сілай, на дагаворнай аснове, заключэннем дынастычных шлюбаў.)*

6. Хто быў першым вялікім князем Літоўскім? *(Міндоўг.)*

7. Калі і дзе ён каранаваўся? *(У 1253 г. у Навагрудку.)*

**II. Умацаванне велікакняжацкай улады і пашырэнне тэрыторыі ВКЛ.**

*Заданні і пытанні:*

1. Назавіце імёны вялікіх князёў літоўскіх XIII—XIV стагоддзяў.

2. Калі і хто з вялікіх князёў літоўскіх перанёс сталіцу Княства з Навагрудка ў Вільню? *(Гедзімін у 1323 г.)*

3. Які вялікі князь літоўскі і калі здзейсніў тры паходы на Маскву? *(Альгерд у 1368, 1370, 1372 гг.)*

4. Якая падзея адбылася 14 жніўня 1385 г. у замку Крэва? *(Была заключана унія паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Польскім Каралеўствам. Паводле яе вялікі князь літоўскі Ягайла станавіўся польскім каралём і захоўваў сваю ўладу ў ВКЛ. Ён павінен быў ахрысціць літоўскае насельніцтва па каталіцкім абрадзе.)*

5. Назавіце дзве важныя ваенныя падзеі, якія адбыліся пры вялікім князе літоўскім Вітаўце. Калі яны адбыліся? *(У 1399 г. на р. Ворскле войскі ВКЛ на чале з Вітаўтам пацярпелі паражэнне ад татарскага войска. У 1410 г. адбылася Грунвальдская бітва, у якой аб'яднаныя сілы ВКЛ і Польскага Каралеўства перамаглі войска Тэўтонскага ордэна.)*

6. Назавіце дзве найбуйнейшыя бітвы літоўскіх войскаў пачатку XVI ст. *(У 1506 г. войска ВКЛ на чале з ваяводам Міхаілам Глінскім разграміла войска крымскіх татараў пад Клецкам. У 1514 г., 8 верасня, пад Оршай аб'яднанае войска ВКЛ і Польскага Каралеўства пад камандаваннем вялікага гетмана літоўскага Канстанціна Астрожскага атрымала бліскучую перамогу над маскоўскім войскам.)*

**III. Органы ўлады Вялікага Княства Літоўскага.**

*Пытанні і заданні:*

1. Якія органы ўлады былі ў ВКЛ у XV ст.? *(Вялікі князь і рада.)*

2. Калі быў выдадзены першы зборнік законаў ВКЛ і якая яго роля? *(Першы зборнік законаў ВКЛ, Судзебнік, быў выдадзены ў 1468 г. Ён устанавіў адзіныя ва ўсім княстве віды пакаранняў за злачынствы: грашовы штраф, смяротнае пакаранне і г.д. Напісаны на старабеларускай мове.)*

3. Які дакумент быў выдадзены ў 1492 г. і ў чым яго сутнасць? *(Вялікі князь Аляксандр выдаў прывілей, паводле якога абавязаўся без дазволу рады не рабіць ніякіх расходаў і не раздаваць самаўладна дзяржаўныя пасады.)*

4. Назавіце дзяржаўныя вышэйшыя пасады ў ВКЛ. *(Маршалак, гетман, канцлер, падскарбі, кашталян.)*

5. Каму ў ВКЛ належала ўлада на месцах? *(У XV ст. ваяводствам кіраваў ваявода, а паветам — стараста.)*

6. Напішыце на класнай дошцы схему дзяржаўнага кіравання ВКЛ у сярэдзіне XVI ст.

7. Назавіце асноўныя зборнікі законаў ВКЛ. *(Судзебнік Казіміра 1468 г., Статут ВКЛ 1529 г., Статут ВКЛ 1566 г.)*

**2. Самастойная работа ў групах.**

Настаўнік прапануе для ўсіх груп аднолькавыя заданні.

Пад кіраўніцтвам кансультантаў вучні выконваюць 5 заданняў. З пачуццём добразычлівасці і цярплівасці, уважліва і аб'ектыўна кансультанты ацэньваюць веды кожнага вучня. Кансультант фіксуе іх у картцы індывідуальнага апытання, у якой пазначана прозвішча вучня і графа для выстаўлення балаў па прапанаваных заданнях. Пасля выканання кожнага задання кансультант падводзіць вынікі. Пасля выканання ўсіх заданняў падводзіцца агульны вынік.

*Заданне 1.* Выберыце правільны адказ.

1. Першым вялікім князем літоўскім быў: а) Даўмонт; б) Трайдзень; в) *Міндоўг*.

2. Герб "Пагоня" быў уведзены: а) *Віценем*; б) Гедзімінам; в) Альгердам.

3. Вільня стала сталіцай ВКЛ пры вялікім князю: а) Віценю; б) *Гедзіміне*; в) Альгердзе.

4. На аўтаномнай аснове ў склад ВКЛ увайшлі княствы: а) *Полацкае*; б) *Віцебскае*; в) Менскае.

5. Гарадзельскі прывілей быў падпісаны ў 1413 г. Ён паклаў пачатак: а) адзінству ВКЛ і Польскага Каралеўства; б) *нераўнапраўю каталіцкага і праваслаўнага насельніцтва*; в) запрыгоньванню сялян.

6. Найбольшых памераў і магутнасці ВКЛ дасягнула пры: а) Гедзіміне; б) Альгердзе; в) *Вітаўце*.

7. "Малая падарожная кніжыца" была выдадзена каля 1522 г. у Вільні: а) Сымонам Будным; б) Міколам Гусоўскім; в) *Францыскам Скарынам*.